**Клюеў, У.** Вайна без фронту / У. Клюеў // Полацкі веснік. — 1999. — 12 лют. — С. 2.

# ВАЙНА БЕЗ ФРОНТУ



У Афганістане я ўзначальваў разведку Джэлалабадскай асобнай мотастралковай брыгады. Раён дыслакацыі быў вельмі неспакойны, калі можна наогул было знайсці хоць адзін спакойны куток у гэтай краіне, ахопленай суцэльнай вайной. Такіх аазісаў там не было. Вайна была без фронту і без тылу. Таму і нашы задачы там рэзка адрозніваліся ад класічных задач вайсковай разведкі. Мы заўсёды былі разам з падраздзяленнямі брыгады. Але на сотню-другую метраў наперадзе. Папярэдзіць нечаканасць было голоўнай нашай мэтай. І гэтым былі заклапочаны з дня ў дзень, днём і ноччу. Разведчык тым і адрозніваўся ад астатніх, што і пасля завяршэння баявой аперацыі, калі войскі выводзіліся на адпачынак, павінен быў забяспечваць бяспеку гэтага адпачынку.

Мы не скардзіліся на свой лёс, ганарыліся сваёй прыналежнасцю да праслаўленага ў ваеннай гісторыі роду вайсковай службы. І я задаволены, што за час маёй службы на чале брыгаднай разведкі ні адзін разведчык не загінуў. Раненні былі. Не ўбярогся і я, падарваўся на міне.

У цэлым жа наша брыгада, як я ўжо заўважыў, кантралюючы вельмі складаны раён, праз які праходзіла 7 караванных шляхоў, дастойна выконвала пастаўленыя перад ёй задачы, бо была першым і ці не адзіным баявым злучэннем, удастоеным ордэна Леніна.

Не магу не заўважыць тут, што метады вайны ў Афганістане былі ў значнай меры прадвызначаны вопытам Вялікай Айчыннай вайны. Адзін з маіх разведчыкаў, таджык, прынёс аднойчы мне выдадзеную на фарсі інструкцыю маджахедам: «Вопыт партызанскай вайны ў Беларусі». Такім чынам, афганская апазіцыя ваявала з намі нашай зброяй, нашым баявым вопытам.

Карыстаючыся выпадкам, шлю сваім баявым пабрацімам самыя найлепшыя пажаданні з выпадку юбілейнай даты – 10-годдзя выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

Маёр Уладзімір Клюеў, былы воін-інтэрнацыяналіст, кавалер ордэна Чырвонага Сцяга і афганскага «За храбрасць».

**У. Клюеў**

**На здымку**: маёр Уладзімір Аляксандравіч Клюеў,
аператыўны дзяжурны штаба ГА г. Полацка